*А. С. Кавалюк (Беларусь)*

# ПРОЗА ЯГОРА КОНЕВА: ЖАНРАВА-ТЭМАТЫЧНЫ ДЫЯПАЗОН, ДУХОЎНА-АКСІЯЛАГІЧНАЯ ПРАСТОРА

Я. Конеў – сучасны беларускі пісьменнік, драматург, публіцыст, у творчасці якога гістарычная тэма займае вызначальнае месца. Паводле Вікіпедыі, яго пяру належаць 5 п’ес, 11 аповесцей, 9 сцэнарыяў дакументальных фільмаў, інсцэніроўкі. Творы пісьменніка склалі кнігі «Вартавыя» (1995), «Тайна пропавшей коллекции» (1999), «Амерыканская адысея Тадэвуша Касцюшкі» (2006) і «Здані Гарадніцы» (2019). Усе празаічныя творы Я. Конева ў Вікіпедыі жанрава пазначаны як аповесці. Знаёмства з бібліяграфічным матэрыялам выявіла, што «Грэчкасейная ідылія Тадэвуша Касцюшкі» і «Літоўская адысея Тадэвуша Касцюшкі» ў «Полымі» за 2008 і 2009 гады друкаваліся як раманы. У кнізе «Амерыканская адысея Тадэвуша Касцюшкі» аднайменны твор пазначаны як раман, а ў анатацыі да кнігі ўдакладняецца яго жанравая разнавіднасць – раман прыгодніцкі. Кніга «Амерыканская адысея Тадэвуша Касцюшкі» надрукавана ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў серыі «Дэбют». У 2007 годзе раман адзначаны заахвочвальнай прэміяй Рэспубліканскага конкурсу на лепшы мастацкі твор «Залаты Купідон». Ёсць падставы гаварыць пра створаную Я. Коневым гістарычную трылогію, прысвечаную Тадэвушу Касцюшку.

Сярод твораў пісьменніка ў Вікіпедыі не пазначаны яго рускамоўныя дэтэктыўныя раманы «Страшное место» (1999), «Чёрная рука» (2000), выдадзеныя ў серыі «Страшныя гісторыі для дзяўчынак і хлопчыкаў», кніга «Золотая корона» (2000), выдадзена, як і «Тайна пропавшей коллекции» (1999), у серыі «Дэтэктыў для дзяўчынак і хлопчыкаў». Гэтыя творы сведчаць, што Я. Конеў працягнуў ствараць распачатую У. Караткевічам дэтэктыўную літаратуру, але робіць гэта на рускай мове, выкарыстоўваючы форму страшылак, і адрасуе іх дзецям.

Думаецца, больш перспектыўным накірункам творчасці гэтага пісьменніка стала яго гістарычная проза, напісаная на харошым мастацкім узроўні. У сваім рамане «Амерыканская адысея Тадэвуша Касцюшкі» Я. Конеў апавядае пра малавядомую старонку жыцця нашага славутага земляка, які па волі лёсу вымушаны быў шукаць заробку далёка ад Айчыны. У 1776–1783 гадах Тадэвуш Касцюшка ўдзельнічаў у вайне за незалежнасць паўночна-амерыканскіх штатаў. Ён кіраваў будаўніцтвам фартыфікацый, камандаваў баявымі палкамі, даслужыўся да звання брыгаднага генерала, спазнаў смяротную небяспеку і радасць перамог. Раман «Амерыканская адысея Тадэвуша Касцюшкі» годна ўпісваецца ў сучасную гістарычную прозу, прысвечаную выбітным гістарычным асобам. Разам з гэтым, аўтару ўдалося стварыць карціну змагання амерыканцаў за сваю незалежнасць, распавесці аб утварэнні ЗША, прадставіць вобраз нацыянальнага героя Вашынгтона. Асаблівa выйгрышна твор вылучаецца з шэрагу іншых сваім духоўна-аксіялагічным зместам. Яго аўтару ўдалося паказаць Тадэвуша Касцюшку не толькі таленавітым прафесіяналам, знаўцам сваёй справы, але і духоўна багатай асобай, якая жыве ў гармоніі са светам, умее наладжваць міжасабовыя зносіны і займаецца парадкаваннем уласнай душы.

У скрушныя і радасныя моманты свайго жыцця Тадэвуш уздымае вочы ў зорнае неба, адчувае Божую благадаць, якая струменіць адтуль: «*Зоры струменілі праз чорную заслону райскае святло. Касцюшка пазіраў у зіхатлівую вышыню і думаў: збудаваў ён Вест-Пойнт – збудуе і Храм у сваёй душы! І паспрабуе ўдасканаліць жыццё вакол сябе*» [1, с. 268]. За ўсё ў сваім пакручастым лёсе ён удзячны Усявышняму. Перакана 	ны сам і пераконвае іншых, што «*не варта скардзіцца на лёс, удача можа прыспець у любы момант*» [1, с. 205]. Фраза «*Мы не маем улады над сваім лёсам*», укладзеная

ў вусны Касцюшкі, пяць разоў паўтараецца ў творы. «*Лёс навучыў мяне цярплівасці*, – прызнаецца герой. – *Варункі жыцця – за межамі нашага розуму. Мы толькі пазней спасцігаем, што выпрабаванні пасылаліся нам нездарма. Дык варта не азлабляцца, не кідаць выклік наканаванню, а набрацца цярплівасці і памятаць – мы не маем улады над сваім лёсам*» [1, с. 250]. Параўноўваючы розныя філасофскія вучэнні, Касцюшка імкнуўся зразумець Боскую мудрасць.

Сімвалічным у рамане з’яўляецца вобраз арла з распрасцёртымі крыламі на сыгнеце, падораным каханай. На яго раўняецца свабодалюбівы Тадэвуш, не скораны нягодамі, душа яго ўжо ляціць да райскага святла. Свайго героя пісьменнік надзяліў моцным пачуццём ліцвінскага патрыятызму. Пры любой нагодзе, калі справа тычыцца яго паходжання, Касцюшка з гонарам падкрэслівае, што ён ліцвін. Ён бязмежна любіць сваю Бацькаўшчыну, дбае пра яе вызваленне. Па-скарынаўску гучыць яго адказ на запрашэнне жанчыны пусціць у Амерыцы карані: «*Я не прыжывуся тут. Мае карані – на Бацькаўшчыне. Рыбіна плыве на нераст праз тысячы водаў у сваё мора, сваё логвішча. Птушка ляціць праз кантыненты ў сваё гняздо. Гэтаксама і я – не пражыву доўга без свайго мора, без свайго гнязда. Паплыву, палячу. Нішто мяне не ўтрымае*» [1, с. 299]. Заканчваецца раман словамі: «*Арол вяртаўся ў сваё гняздо*» [1, с. 302].

У рамане паказана самаадданае каханне Касцюшкі да Людвікі Сасноўскай. Каханая спадарожнічае яму анёлам-ахоўнікам і ў амерыканскай адысеі, хоць бацькам выдадзена замуж за іншага. Шэкспіраўскія страсці выяўляюць радкі яе ліста: *«Думкай я імкнулася да цябе, любы Тадэ. Як мая душа была з табой, так маё сэрца і цяпер належыць табе, і толькі цела я аддала князю. Я сказала яму гэта перад вянчаннем, а табе кажу пасля вяселля. І хачу запэўніць, што сэрцам я нязменна і да труны твая…»* [1, с. 245]. Я. Конеў прадэманстраваў майстэрства раскрыцця ўнутранага свету сваіх герояў, выявіў уласныя каштоўнасныя прыярытэты.

Кнігу «Здані Гарадніцы» склалі аднайменны твор і аповесці «Смаргонскі настаўнік і вучань», «Нямігі берагі», «Вандроўныя былі». Сваёй аповесцю «Здані Гарадніцы» Я. Конеў упісаў цікавую старонку ў заходне-беларускую тэму ў нацыянальнай літаратуры, распачатую Я. Брылём, працягнутую В. Адамчыкам, Г. Марчуком, інш. Я. Конеў паказаў акупацыйны рэжым на «крэсах усходніх» палякаў, Саветаў і немцаў. Польская дзяржаўная палітыка была накіравана на тое, каб «*праз дваццаць гадоў на крэсах <…> беларусаў шукаць са свечкай!*» [2, с. 152]. Аўтар згадвае розныя метады вынішчэння ўсяго беларускага ў Наднямонні (арышты членаў КПЗБ, Сацыялістычнай сялянскай Грамады, Таварыства беларускай мовы, закрыццё беларускіх суполак), паказвае меры пакарання мясцовага насельніцтва. «*За знойдзеную пры вобыску беларускамоўную кніжыцу прысуджалі шэсць гадоў катаргі або тры гады зняволення ў Бярозе-Картузскай. Той Бярозы баяліся болей за катаргу. Вязні вярталіся адтуль хворымі на сухоты інвалідамі. Калі наогул вярталіся*» [2, с. 152].

Дзейнасць савецкіх службістаў, па мастацкай версіі пісьменніка, распачалася з вывучэння архіваў былой адміністрацыі і складання спісаў палітычна небяспечных і падазроных асоб. У сакавіку 1940 года «*паводле тых спісаў арыштавалі ўсіх палякаў, хто займаў хоць нейкую адміністрацыйную пасаду ў папярэднія дваццаць гадоў – нават леснікоў. У красавіку – фабрыкантаў, памешчыкаў і ўладальнікаў крамаў. У траўні – бежанцаў-яўрэяў, якія ўцяклі з акупаванай немцамі Польшчы. У чэрвені – усіх, хто меў шляхецкі радавод. У ліпені – асаднікаў, уладальнікаў хутароў, рамеснікаў і гандляроў. У жніўні – усіх, хто ўваходзіў хоць у якую партыю або згуртаванне, не выключаючы членаў забароненых КПЗБ, Грамады, Таварыства беларускай мовы. У верасні – святароў, якія не паспелі схавацца*» [2, с. 172]. Дзейнасць спецслужбаў абапі-

ралася на «*самы мярзотны і дзейсны ва ўсе часы сродак – данос*» [2, с. 161]. Дастаткова было ў Надзвычайную камісію па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам прыйсці ананімнаму лісту, у якім «ахвяра» называлася *польскім шпегам*, доказаў віны не прад'яўлялася, а трыбунал, сыходзячы з прынцыпу «рэвалюцыйнай мэтазгоднасці», прыгаворваў да расстрэлу.

Немцы сваё прыбыванне на акупіраванай тэрыторыі распачалі з «фільтрацыі» мужчын ва ўзросце ад 16 да 45 гадоў, з *"санітарнай" акцыі па ачышчэнні краю ад няякаснага чалавечага матэрыялу*» – расстрэлу большай часткі мужчын, знішчэння яўрэяў.

На фоне гістарычных зменаў у Заходняй Беларусі ў 20–40-я гады XX стагоддзя ў «Зданях Гарадніцы» намалявана жыццё артыстаў правінцыйнага тэатра. Праз біяграфію галоўнага героя твора – статыста Пётры Куцыёнка – пададзена гісторыя беларускага тэатра ў XX ст., уведзены звесткі пра тэатры Тызенгаўза і В. Дуніна-Марцінкевіча. Вобраз Куцыёнка атрымаўся надзвычай змястоўным. За знешняй яго неахайнасцю хавалася творчая асоба, патрыёт-беларус, сумленны чалавек, непрымірымы змагар са злом. Ён становіцца анёлам-ахоўнікам жанчыны, якую кахае, нягледзячы на яе пагардлівыя адносіны да сябе.

Асаблівасцю наратыўнай стратэгіі Я. Конева ў аповесцях «Здані Гарадніцы» і «Нямігі берагі» з'яўляецца тое, што адным з герояў гэтых твораў стаў сам аўтар, чалавек неабыякавы да мінулага роднага краю. Сваімі аповесцямі ён нібы хоча абудзіць пачуццё нацыянальнай свядомасці суайчыннікаў. Неаднойчы ў тэкстах сустракаецца думка пра абыякавасць да сваёй мінуўшчыны як адмысловую рысу беларусаў. Лейтматывам аповесці «Нямігі берагі» з'яўляецца думка: «*важна, што паспееш зрабіць*». У творы, прысвечаным векапомным падзеям мінскай гісторыі, зноў жа перакрыжоўваецца сучаснасць і гісторыя. Розныя нягоды зведалі героі твора. Князь Рагвалод у 947-м разграміў племя няміжан і пабудаваў пагост на месцы іх гарадзішча. Князь Глеб біўся з кіяўлянамі ў 1067-м. Князь Барыс абараніў горад ад татарскай навалы ў 1505-м. Афіцэр СС Аленштайн кіраваў археалагічнымі раскопкамі ў акупаваным Мінску ў 1943-м. Юны мінчанін Зміцер рашаўся на самагубства за гадзіну да трагедыі на Нямізе ў маі 1999-га... Кожны з іх сутыкнуўся з праклёнам, кінутым тысячу гадоў таму ўладальніцай неміжан, і здзейсніў свой усвядомлены выбар. Разам са сваімі героямі аўтар разважае аб сэнсе жыцця, спрадвечных ісцінах, граху пыхлівасці, сумленні як Божым голасе і інш.

Знаёмства з прозай Я. Конева дазволіла выявіць яе жанрава-тэматычную разнастайнасць, духоўна-аксіялагічную прастору, схільнасць пісьменніка да гістарычнай тэматыкі, дэтэктыўна-прыгодніцкай скіраванасці.

**Літаратура**


1. Конеў, Я. Амерыканская адысея Тадэвуша Касцюшкі : раман / Я. Конеў. – Мінск : Маст. літ., 2006. – 302 с.
2. Конеў, Я. Здані Гарадніцы : аповесці / Я. Конеў. – Мінск : Звязда, 2019. – 304 с.



*Г. В. Кажамякін (Беларусь)*


## ЛІСТЫ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА, АДРАСАВАНЫЯ МАКСІМУ ТАНКУ (ДА 90-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА)

Эпісталярная спадчына Уладзіміра Караткевіча складае значную частку напісанага класікам беларускай літаратуры. Сярод гэтых лістоў ёсць як